

РЭГІЁНЫ ВЫЗНАЧЫЛІ СТРАТЭГІЮ РАЗВІЦЦЯ 3

ЯШЧЭ З ДАЖДЖАМІ І НАВАЛЬНІЦАМІ 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

28 ЛІПЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 144 (30024)

## КОРАТКА

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27 ліпеня падпісаў Указ № 227 «Аб звальненні ў запас і прызыве на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве».**

• Беларускія вучоныя сёлета вывелі сарты збожжавых з ураджайнасцю да 100 ц/га.

• **БУТБ мае намер павялічыць колькасць акрэдытаваных кампаній з Пакістана.**

• Бюджэт пражытачнага мінімуму павышаецца з 1 жніўня ў Беларусі.

• **У эканоміку Гомельскай вобласці маюць намер інвеставаць Br1,2 млрд у трэцім квартале.**

• Беларусь накіравала звароты аб прыёме ў БРІКС.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Галоўнае пытанне — сітуацыя на палях»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам віцэ-прэм'ера Леаніда Зайца, адказнага за аграрны кірунак. «Галоўнае пытанне — як на палях у нас сёння сітуацыя? Як складваецца ўборка ўраджаю?» — запытаў кіраўнік дзяржавы.**



Фота БелТА.

Другое, але не меншае па значнасці, пытанне — кадры. У мінулую пятніцу на селектарнай нарадзе Прэзідэнт прызначыў міністра сельскай гаспадаркі Ігара Брыло памочнікам у Віцебскай вобласці. А ўраду было даручана на працягу тыдня прапанаваць кандыдатуру новага міністра сельскай гаспадаркі.

«То-бок кадры і арганізацыя ўборачных работ на сёння. А ў хуткім часе я пастараюся пабыць (у рэгіёнах. — **Заўв.**). У мяне ў плане захад паглядзець. Якраз зона тваёй адказнасці — Гродзенская вобласць. Паглядзім, магчыма, Брэсцкую вобласць. Цэлы комплекс работ Міністэрства сельскай гаспадаркі», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў пра сваё даручэнне зрабіць цукеркі з сухога малака. Падчас наведвання малочнатаварнага комплексу ў Аршанскім раёне ён расказаў, што пакаштаваў кітайскія цукеркі з сухога малака. Улічваючы што ў Беларусі хапае сыравіны, Прэзідэнт прапанаваў наладзіць вытворчасць такіх ласункаў і ў нас. Праз два тыдні пробная партыя цукерак была на стале ў Прэзідэнта.

«Табе цукеркі даручалася зрабіць. Зрабіў ты іх ці не? Каб людзі разумелі, што ў нас сухога малака абястлушчанага — мора. А ў Кітаі мы падгледзелі іх тэхналогіі вытворчасці рознага кшталту кандытарскіх вырабаў, у дадзеным выпадку цукерак. Наогул без цукру з сухога малака. Можна дадаваць туды нейкія раслінныя дабаўкі. Асабліва для дзяцей. Шчыра кажучы, калі Мікалай прывёз мне іх з Кітая, я пакаштаваў сам. Вядома, гэта не для мяне. Але дзеці, маленькія дзеці з найвялікшым задавальненнем спажываюць гэты ласунак. Чаму мы не можам рабіць гэта і прадаваць? І галоўнае, сваіх людзей забяспечыць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, яшчэ раз звярнуўшы ўвагу, што ў Беларусі сухога малака мора.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ПРАКАПЕНКА, начальнік упраўлення нацыянальных каманд Міністэрства спорту і турызму, старшыня Беларускай федэрацыі сучаснага пяціборства:**

*«Напэўна, адной з яркіх адметных асаблівасцяў II Гульняў краін СНД адносна першых з'яўляецца тое, што яны адкрытыя. І акрамя краін, што прадстаўляюць СНД, у нас яшчэ будзе дастатковая колькасць замежных дзяржаў, якія выказалі жаданне ўзяць удзел у гэтым мультыспартыўным мерапрыемстве. Каля 20 краін ужо пацвердзіла свой удзел. І мы вельмі разлічваем, што іх лічба можа толькі павялічыцца. Па спартсменах у акрэдытсістэме ўжо перайшло за дзве тысячы».*

Наша кіно

## Гісторыя ажывае на «Беларусьфільме»

**На кінастудыі «Беларусьфільм» працягваюць ствараць новыя фільмы. Цяпер якраз ідзе работа над кінастужкай пра вайну пад рабочай назвай «Казбек». Рэжысёр Іван ПАЎЛАЎ, вядомы шырокаму колу гледачоў па такіх карцінах, як, напрыклад, «Свежына з салютам», «Глыбокая плынь», «На спіне ў чорнага ката», «Вой, ма-мач-кі!», нядаўніх — «Полымя пад попелам», «Падрыў», збіраецца распавесці новую гісторыю. «Звязда» завітала на адну з лакацый, дзе праходзяць здымкі, каб бліжэй пазнаёміцца з тымі, хто стварае вялікае кіно, і паназіраць за героямі яшчэ да іх з'яўлення на экранах.**

СТАР. 4



Па палічках

## ЧЭКІ ПАВІННЫ ПРЫНОСІЦЬ ДАХОД

**Нашы чытачы часта пытаюцца, як абмяняць чэкі «Маёмасць» на акцыі і ці можна вярнуць чэкі назад, калі ў кампаніі нешта пайшло не так. Адказваем з дапамогай спецыялістаў.**

### Каштоўныя паперы 153 прадпрыемстваў

Першае — трэба выбраць падыходзячае аддзяленне банка, якое працуе з такімі іменнымі чэкамі. Для гэтага на сайце фінансавай установы трэба ўвесці пошук канкрэтнага аддзялення, вашага рэгіёна (вобласці), дзе ў катэгорыі «Паслугі» трэба ўпісаць «Аперацыі з чэкамі «Маёмасць».

СТАР. 3




ISSN 1990 — 763X

# «Галоўнае пытанне — сітуацыя на палях»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Леанід Заяц далажыў, што пад вытворчасць выпрабавальнай партыі пакуль задзейнічалі лінію на заводзе медпрэпаратаў: «Тут у складзе сухое малако. Некаторыя ёсць — дзіцячае харчаванне да 40 % даходзіць. Сухое неразведзенае малако, сыроватка. Розны склад. Але вельмі прыемныя на смак, і для спажыўца дастаткова нядрэнны прадукт», — сказаў ён.

«Трэба пакаштаваць і дарослым людзям, асабліва дзецям. Гэта вельмі важна, што мы расліннага паходжання дабаўкі можам уключаць. Кітайцы малайцы. Яны ўхапіліся за гэта і апанавалі свой рынак такім ласункам. Але мы можам проста і ў Кітай пастаўляць», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што цукеркі можна пастаўляць і ў краіны Афрыкі. «Ды куда заўгодна. Мы ж працуем з імі», — адказаў кіраўнік дзяржавы.

Пакуль, па словах Леаніда Зайца, трэба апрацаваць лінію па вырабе цукерак. «Нават дзве лініі трэба», — заўважыў Прэзідэнт. Таксама цяпер трэба распрацаваць упакоўку ласунку, каб прадаваць яго ў належным выглядзе. На пытанне кіраўніка дзяржавы, ці ўжо вырашана дадзенае пытанне, віцэ-прэм'ер адказаў станоўча.

«Трэба зрабіць дастатковую колькасць і апрацаваць у дзіцячых садках, у школах і гэтак далей», — падсумаваў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

### Тэхнічных магчымасцяў і людскіх рэсурсаў дастаткова для таго, каб убраць усё своечасова і без страт

У размове з журналістамі Леанід Заяц паведаміў, што на раніцу 27 ліпеня ўбрана каля 16 працэнтаў усяго збожжавага палетка, намалочана 1,156 млн тон пры ўраджайнасці 36,2 ц/га. «Стрымліваецца ўборка з-за ўмоў надвор'я. Тэхнічная гатоўнасць вельмі высокая, камбайны спраўныя, сушыльная гаспадарка працуе на ўсе сто працэнтаў. Чакаем на ўскрайку поля добрых умоў і пачынаем уборку. Кожную гадзіну выкарыстоўваем для таго, каб можна было ўбраць хлеб. Тэхнічных магчымасцяў і людскіх рэсурсаў дастаткова для таго, каб убраць усё своечасова і без страт», — падкрэсліў ён.

Па словах віцэ-прэм'ера, на ўзроўні ўрада і кіраўніка дзяржавы прыняты ўсе неабходныя рашэнні для арганізацыі ўборкі збожжавых культур, у тым ліку па забеспячэнні сельгасарганізацый палівам, запчасткамі для тэхнікі, дадатковым аўтатранспартам.

Праводзіцца ўборка азімага рапсу, ён убраны на 61 працэнце плошчаў, ураджайнасць складае 24,4 ц/га, што вышэй за паказчыкі мінулага года. Леанід Заяц падкрэсліў, што сёлета чакаецца ўраджай азімага рапсу ў аб'ёме больш як 800 тысяч тон плюс яравы рапс. «Валавы збор рапсу сёлета будзе не ніжэйшы, чым летась, што дасць магчымасць забяспечыць выкананне дзяржаўнага заказу», — запэўніў віцэ-прэм'ер. У лік дзяржзаказу сёлета прадпрыемствы павінны паставіць каля аднаго мільёна тон збожжа, у тым ліку 807 тысяч тон харчовага збожжа. Ужо адгружана 60 тысяч адборнага харчовага збожжа, таксама рэалізавана 20 тысяч тон півоварнага ячменю.

Леанід Заяц таксама расказаў, што Прэзідэнтам пастаўлена задача — да канца бягучага года неабходна наладзіць масавую вытворчасць цукерак з сухога малака і для ўнутранага спажывання, і для экспарту за межы нашай дзяржавы. Для запуску масавай вытворчасці будзе ажыццяўляцца закупка неабходнай тэхналагічнай лініі, у тым ліку па фасоўцы, упакоўцы.

# «Беларусь як адна з краін-заснавальніц не можа спакойна глядзець на тое, што адбываецца ў ААН»

**Ад пытанняў унутраных да парадку дня міжнароднага. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з пастаянным прадстаўніком Беларусі ў ААН Валянцінам Рыбаковым.**

«Арганізацыя Аб'яднаных Нацый — што гэта такое на сёння? Якія перспектывы ўвогуле гэтай арганізацыі з вашага пункту гледжання? І нам што рабіць у гэтай арганізацыі», — спытаў кіраўнік дзяржавы. «Натуральна, мы, адна з краін-заснавальніц гэтай арганізацыі, не можам спакойна глядзець на тое, што адбываецца там», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што абмяркоўваў дадзеную тэму і са сваім расійскім калегам. «Сакратарыят ААН, рабочы орган — яны ўжо пачалі працаваць з пункту гледжання нейкіх пераваг адной ці дзвюм дзяржавам, або Захаду-Усходу. Гэта значыць яна ўжо, тая арганізацыя, ператвараецца ў арганізацыю «чаго вашай ласцы?» і ад буйных дзяржаў больш залежыць. Гэта ненармальна пры тым ціску, які аказваюць буйныя дзяржавы заходнія», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка ў якасці прыкладу згадаў саміт «Расія — Афрыка», што праходзіць гэтымі днямі, і жудасны ціск, які амерыканцы і краіны Заходняй Еўропы аказвалі на яго ўдзельнікаў. «Гэта ненармальна, — падкрэсліў ён. — Паўстае пытанне, што рабіць. І хацелася б для таго, каб разумець самому, што рабіць, выслухаць ваш пункт гледжання», — сказаў беларускі лідар.

Ён пацікавіўся работай беларускага прадстаўніцтва ў ААН, ці не фармальна яно прысутнічае там і што рэальна можа. «Напрыклад, калі заходнія дзяржавы адмовіліся фактычна супрацоўнічаць з намі, ну што ж, мы сёння дыпламатаў пераводзім на тыя напрамкі, дзе нам трэба працаваць, дзе трэба ўзмацняць сітуацыю і абстаноўку. Можа быць, і з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый так паглядзець і паставіць іх у шэраг з заходнімі дзяржавамі?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

Валянцін Рыбакоў адзначыў, што ААН — гэта не проста будынак і не сакратарыят сам па сабе. Гэта 193 краіны. І Беларусь як адна з заснавальніц гэтай арганізацыі актыўна ў ёй працуе. «Мы працуем у першую чаргу не з міжнароднымі чыноўнікамі. Мы працуем з дзяржавамі, якія прадстаўлены ў гэтай арганізацыі», — сказаў дыпламат.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

### ААН — гэта 193 краіны, і Беларусь — адна з іх

Супрацоўніцтва з ААН з'яўляецца найважнейшым вектарам беларускай знешняй палітыкі. Наша краіна ўвайшла ў лік краін — заснавальніц арганізацыі і з самых першых дзён свайго членства заняла ў ёй актыўную пазіцыю. На палях ААН Мінск уносіў і ўносіць шэраг прапаноў, звязаных з дзейнасцю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

У размове з журналістамі Валянцін Рыбакоў расказаў, што Прэзідэнт даў шэраг даручэнняў па актывізацыі работы нашага пастаяннага прадстаўніцтва пры ААН з дзяржавамі — членамі арганізацыі. «Мы будзем гэта прадаўжаць рабіць. Ёсць шэраг напрамкаў, дзе мы вельмі паспяхова працуем. Некаторыя з напрамкаў нарадзіліся пасля выступленняў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У прыватнасці, пытанне барацьбы з гандлем людзьмі, некаторыя іншыя пытанні. Таму мы будзем працягваць актыўна працаваць, супрацоўнічаць з дзяржавамі і прасоўваць нашы нацыянальныя інтарэсы», — сказаў ён.

Валянцін Рыбакоў звярнуў увагу, што ААН — гэта ў першую чаргу 193 краіны, сярод якіх і Беларусь. А генеральны сакратар, сакратарыят і міжнародныя чыноўнікі абслугоўваюць работу дзяржаў — членаў арганізацыі. «Мы ў грамадстве вельмі часта блытаем чамусьці і лічым, што ААН — гэта нейкая злавесная структура, будынак дзесьці ў цэнтры Манхэтана на беразе Іст-Рывер», — растлумачыў ён.

Па словах дыпламата, ААН крытыкуюць фактычна з моманту яе ўзнікнення: «І ёсць за што крытыкаваць. За бюракратызм, марудлівасць у прыняцці рашэнняў, нейкія іншыя рэчы, празмерную палітызацыю. Тое, аб чым сказаў Прэзідэнт сёння на сустрэчы, калі супрацоўнікі Сакратарыята ААН, якія павінны быць бестароннімі, у нейкіх пэўных канфліктных сітуацыях цяпер займаюцца палітыканствам, займаюць той ці іншы бок. Мы працуем з дзяржавамі-членамі. Гэта наша асноўная задача. У нас ёсць пэўныя поспехі, ёсць і правалы, ёсць цяжкасці, з якімі мы гераічна змагаемся. Гэта ўнікальная міжнародная пляцоўка. Унікальнасць яе заключаецца ў тым, што гэта адзіная пляцоўка, на якой прадстаўлены практычна ўсе дзяржавы свету. І вось у гэтым каштоўнасць арганізацыі».

Пастаянны прадстаўнік Беларусі растлумачыў, што міжнародныя чыноўнікі ў ААН нічога нікому не могуць дыктаваць у плане парадку дня. Парадак дня — гэта тыя пытанні, якія выносяцца на разгляд Генеральнай Асамблеі або Савета Бяспекі ААН самімі дзяржавамі. Генеральная Асамблея разглядала пытанні, якія былі ініцыіраваны Беларуссю або іншымі краінамі. Напрыклад, Беларусь ініцыіравала работу па супрацьдзеянні гандлю людзьмі, супрацоўніцтва па чарнобыльскай тэматыцы, выступае за ўстойлівае развіццё краін з сярэднім узроўнем даходу, абарону інтарэсаў традыцыйнай сям'і і некаторыя іншыя пытанні. Гэтаксама працуе і Савет Бяспекі. «Любая дзяржава або група дзяржаў мае права вынесці на разгляд Савета Бяспекі тое ці іншае пытанне. І яно разглядаецца. Тут вельмі важна з улікам сітуацыі вакол Беларусі зрабіць так, каб нейкае негатыўнае для нас пытанне або аспект не стала пунктам парадку дня Савета Бяспекі або Генеральнай Асамблеі. Вось гэтаму негатыўнаму сцэнарыю мы паспяхова супрацьстаім там, дзе тое неабходна рабіць», — адзначыў Валянцін Рыбакоў.

Як прыклад адной з перамог беларускай дыпламатыі ён прывёў закрыццё ў Савеце Бяспекі тэмы інцыдэнту з самалётам «Раянэйр». «Мы фактычна адным нашым выступленнем закрылі тэму «Раянэйр» у Савеце Бяспекі. Наша выступленне поўнасцю паставіла кропку. У Савеце Бяспекі гэтае пытанне больш не разглядалася ніколі», — расказаў Валянцін Рыбакоў. Яшчэ адна невялікая перамога звязана з чарнобыльскай тэматыкай.

«Сёлета мы павінны былі прадставіць праект рэзалюцыі па чарнобыльскім супрацоўніцтве. Разумеючы рэгіянальную сітуацыю, мы адмовіліся гэтак рабіць. Разумеючы, што ў праект маглі быць унесены іншымі краінамі нейкія моманты, якія нас катэгарычна не задавальняюць. І мы б апынуліся ў сітуацыі, калі мы, уносячы дакумент, вымушаныя былі б потым нешта з ім рабіць — здымаць яго з разгляду, нейк супрацьдзейнічаць гэтым негатыўным усім аспектам. Мы не ўнеслі праект рэзалюцыі», — сказаў дыпламат. Паводле яго слоў, тады праект рэзалюцыі па чарнобыльскім супрацоўніцтве ўнесла Украіна. «Практычна ўкраўшы ў нас поўнасцю тэкст папярэдняй рэзалюцыі, папярэдняга праекта. На здзіўленне Украіны і еўрапейскіх дзяржаў, мы выступілі суаўтарамі разам з Расіяй», — расказаў Валянцін Рыбакоў. Па яго словах, гэта стала шокавай сітуацыяй для еўрапейскіх чыноўнікаў. Але чарнобыльскае супрацоўніцтва для беларускага боку — святая справа.

Ён звярнуў увагу на тое, што такія дробныя на першы погляд перамогі насамрэч проста не даюцца і яны вельмі карысныя для краіны. «Мы будзем працягваць такую работу», — запэўніў дыпламат.

## Міжнародная дзейнасць

# Стан і перспектывы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва

### абмеркавала Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА на рабочай сустрэчы з паслом Беларусі ў КНР

**Рэспубліка Беларусь і Кітайская Народная Рэспубліка ўсталявалі вельмі цёплыя, добрыя партнёрскія адносіны, пракаментаваў прэс-службе Савета Рэспублікі вынікі сустрэчы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы Юрый СЯНЬКО.**

«У верасні мінулага года ў Самаркандзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка і Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін прынялі рашэнне аб павышэнні адносін паміж нашымі краінамі да ўзроўню ўсебаковага і ўсепагоднага стратэгічнага партнёрства. Гэта дало новы штуршок наперад нашым адносінам у эканоміцы, парламенцкай дзейнасці і ў многіх іншых сферах нашага двухбаковага ўзаемадзеяння», — сказаў кіраўнік беларускай місіі ў Пекіне.

Вельмі важным стала рашэнне кіраўнікоў дзвюх краін аб рэгіянальным супрацоўніцтве, дадаў пасол. «Нашы рэгіёны — вобласці Рэспублікі Беларусь і правінцыі Кітайскай Народнай Рэспублікі — працягваюць падпісваць двухбаковыя пагадненні аб партнёрскіх, пабрацімскіх адносінах. І ў развіццё такіх адносін падпісваю праграмы двухбаковага ўзаемадзеяння, у якіх адлюстраваны розныя сферы дзейнасці: спорт, турызм, эканоміка, адукацыя, ахова здароўя і многае іншае», — звярнуў увагу дыпламат.

Уся гэтая работа, па словах Юрыя Сянько, высокаарганізаваная і выкананне на ўсіх рэгіянальных узроўнях дае свае эфекты. Узаемны гандаль паміж Беларуссю і Кітаем увесь час расце, не сталі выключэннем нават пандэмійныя гады.

«У 2022 годзе ў параўнанні з 2021-м мы з КНР павялічылі аб'ём экспарту беларускай прадукцыі на 700 мільёнаў долараў — гэта добры вынік. 2023 год не з'яўляецца выключэннем. Вось ужо пяць месяцаў у параўнанні з 2022-м мы канстатуем 163-працэнтнае павелічэнне аб'ёму нашага беларускага экспарту ў КНР», — канстатаваў дыпламат.

Вельмі цеснае ўзаемадзеянне з Кітаем ідзе па лініі аховы здароўя, спорту, культуры, сельскай гаспадаркі, прамысловасці. Сёння ствараецца шэраг праектаў, якія дадуць у самай блізкай перспектыве добры вынік, рэзюмаваў Юрый Сянько.

# Асабісты прыём у Мінску

2 жніўня 2023 г. з 10.00 да 13.00 старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, у адміністрацыі Савецкага раёна горада Мінска (вул. Дарашэвіча, 8).

28 і 31 ліпеня з 10 да 13 гадзін і з 14 да 17 гадзін можна запісацца на гэты прыём па тэлефонах: 8 (017) 327-25-27, 8 (017) 327-27-09. Можна таксама накіраваць адпаведны ліст на адрас: 220016, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 9.

Прыярытэты

# РАБОТА НА ВЫНІК

## Рэгіёны вызначылі стратэгію развіцця

**Прайшлі пасяджэнні шэрагу аблвыканкамаў, дзе былі прааналізаваны вынікі работы ў першым паўгоддзі і вызначана стратэгія дзейнасці на перспектыву.**

### У кантэксце чалавека



Валавы рэгіянальны прадукт Мінскай вобласці ў студзені—чэрвені склаўся ў суме Br17,8 млрд, гэты паказчык павялічыўся на 6,7 працэнта (пры заданні 2,5 працэнта), заявіў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН** на пасяджэнні Мінаблвыканкама, на якім разглядаліся вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця ў першым паўгоддзі, паведаміла БелТА.

«З аднаго боку, вобласць выконвае практычна ўсе даведзеныя прагнозныя паказчыкі. Нядрэнны вынік дасягнуты па валавым рэгіянальным прадукце — тэмп росту 106,7 працэнта. Выкананы паказчыкі па інвестыцыях, будаўніцтве жылля, заработнай плаце, паступленнях у бюджэт. З другога боку, усе павінны разумець, што гэтыя тэндэнцыі — аднаўленчы рост у параўнанні са складаным мінулым годам. Таму ўсе нашы поспехі і дасягненні трэба разглядаць менавіта ў такім кантэксце», — сказаў Аляксандр Турчын. Паводле яго слоў, адна з задач для кіраўнікоў разам з выкананнем паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця — максімальна зніveліраваць, а лепш ліквідаваць мінулагоднее адставанне, звязанае як з аб'ектыўнымі, так і суб'ектыўнымі прычынамі.

«Разлікі зразумелыя. Зразумелыя тыя лічбы, якія мы павінны дасягнуць. Але для большасці людзей, што жывуць у вобласці, усе гэтыя прагнозныя паказчыкі — малазначныя лічбы. Кожны глядзіць на сваю зарплату, узровень цэн у краме, як працуюць сістэмы адукацыі, аховы здароўя, якія дарогі, якая вада цячэ з крана. Вось што хвалюе грамадзян, а з гэтым у нас вялікая колькасць праблем», — адзначыў Аляксандр Турчын, звярнуўшы ўвагу, што менавіта на іх вырашэнні неабходна ў першую чаргу сканцэнтраваць намаганні.

### Ад Расіі да Афрыкі



Тэмп росту ВРП Брэсцкай вобласці ў першым паўгоддзі склаў 102,5 працэнта. Такая інфармацыя прагучала на пасяджэнні аблвыканкама.

**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** адзначыў няпростыя ўмовы, у якіх даводзіцца працаваць эканоміцы. «У той жа час за мінулы год і першае паўгоддзе мы бачым, як можна працаваць у гэтых умовах. Ёсць плюсы, ёсць мінусы. Дынаміка, на жаль, нераўнамерная па раёнах. Агульная карціна вынікаў вобласці ў многіх напрамках здавальняючая. Але рэзервы ёсць», — звярнуў увагу губернатар.

Па выніках першага паўгоддзя ў рэгіёне выкананы ўсе мэтавыя паказчыкі эфектыўнасці работы. Добрыя тэмпы росту дабаўленай вартасці забяспечаны практычна ва ўсіх галінах рэальнага сектара эканомікі і па большасці відаў дзейнасці сферы паслуг. У сельскай гаспадарцы па асноўных відах жывёлагадоўчай прадукцыі прырост ідзе апераджальнымі тэмпамі. У прамысловым сектары працягнулася дадатная дынаміка росту вытворчасці.

Як адзначыў **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый ГАРАДЗЕЦКІ,** які курыруе пытанні эканомікі, вобласць справілася і з заданнем па інвестыцыях. «Працягнулася далейшая пераарыентацыя экспарту, — сказаў віцэ-губернатар. — Прадпрыемствы вобласці актыўна наладжваюць узаемавыгаднае супрацоўніцтва з Расіяй, краінамі Азіі. Будзем узаемадзейнічаць і з краінамі Афрыкі».

### Рэзервы росту



Тэмп росту валавога рэгіянальнага прадукту Гомельскай вобласці ў першым паўгоддзі склаў 102,3 працэнта пры прагнозе 102 працэнты. Такую лічбу агучыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО** на пасяджэнні аблвыканкама.

Гаворачы аб сектарах эканомікі, Іван Крупко адзначыў: асноўную прыбаўку атрымалі ў прамысловасці — 108,3 працэнта. «Разам з тым шэраг прадпрыемстваў прасядае — гэта дрэваапрацоўка, асобныя прыватныя арганізацыі, камунальная прамысловасць. Задача кіраўнікам, органам кіравання гэтых прадпрыемстваў, свабоднай эканамічнай зоне — выйсці ў другім паўгоддзі на дынаміку росту», — падкрэсліў Іван Крупко.

У цэлым па выніках першага паўгоддзя ў вобласці выконваюцца шэсць паказчыкаў матрыцы задач, вызначаных урадам. «Па інвестыцыях у асноўны капітал вобласць пакуль не забяспечвае прагноз, але дынаміка ёсць. У пачатку года былі складзены графікі інвестыцый па кожным раёне, прадпрыемстве і аб'екце. І калі ў цэлым па вобласці аб'ём планавых укладанняў выконваецца, то асобныя раёны сур'ёзна адстаюць. Кіраўнікам тэрытарый і галін неабходна распісаць па кожным аб'екце, як і за кошт чаго будзе кампенсавана адставанне, і пад асабістую адказнасць забяспечыць выкананне па інвестыцыях у трэцім квартале», — даручыў Іван Крупко.

Ён нагадаў: канкрэтныя задачы па выпраўленні сітуацыі ўжо пастаўлены. Вызначаны планы дзеянняў і для выхаду на запланаваныя значэнні ў сельскай гаспадарцы. Старшыня аблвыканкама падкрэсліў: важна па кожнай галіне, тэрыторыі прадпрыемства вызначыць, дзе ёсць недапрацоўкі, за кошт чаго будзе забяспечаны рост эканомікі і выкананне ўстаноўленых прагнозных параметраў.

# ЧЭКІ ПАВІННЫ ПРЫНОСІЦЬ ДАХОД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А па пэўнай спасылцы на сайце Беларусбанка можна знайсці спіс прадпрыемстваў, на чые акцыі тыя самыя чэкі можна абмяняць. Спіс прыватызуемых прадпрыемстваў, акцыі якіх абменьваюць на чэкі «Маёмасць» па стане на 19 чэрвеня бягучага года, налічвае 153 акцыянерныя таварыствы.

Гэта ў асноўным будаўнічыя, механізаваныя і аграрна-перапрацоўчыя прадпрыемствы. Сярод іх сустракаюцца і досыць цікавыя. Напрыклад, прапануюць абмяняць свае акцыі на чэкі папяровая фабрыка «Спартак» са Шклова, акцыянернае таварыства «Віцебскі маторарамонтны завод», Навагрудскі завод газавай апаратуры, «Рыбгас «Грыцава» каля вёскі Цемяніца, сталічнае прадпрыемства «Даследчы завод металаканструкцый», Хоцімскі льнозавод і Радашковіцкі керамічны завод.

### Прад'явіце пашпарт

Таксама ў тэлеграм-канале Беларусбанка гаворыцца, што ён у сваёй дзейнасці, звязанай з аказаннем паслуг па абароце чэкаў «Маёмасць», кіруецца заканадаўствам краіны і выконвае ролю пасрэдніка пры ажыццяўленні аперацый па абмене акцыі прыватызуемых прадпрыемстваў на чэкі. Для выканання адпаведных аперацый фізічная асоба прад'яўляе пашпарт грамадзяніна нашай краіны і сертыфікат чэкаў.

Трэба ведаць, што абмену на акцыі падлягаюць чэкі, налічаныя пакупніку (квота на маёмасць дзяржаўных прадпрыемстваў) і атрыманыя ў спадчыну. Можна выкарыстоўваць чэкі, налічаныя пакупніку ў якасці квоты на маёмасць дзяржаўных прадпрыемстваў і выкарыстаныя ім у адпаведнасці з артыкулам 11 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб імянных прыватызацыйных чэках Рэспублікі Беларусь», а пасля вернутыя ў той жа колькасці на яго спецыяльны рахунак (чэкавы) рахунак з прычыны таго, што не адбыліся здзелкі, было скасаванне дагавораў, ліквідацыя суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці.

### Падарунак ад сваякоў

Прымае банк і чэкі, пераафомленыя пакупніку ад блізкіх сваякоў (бацькоў, дзяцей, мужа і жонкі, родных братоў і сясцёр, унукаў, бабуль, дзядуляў, свекрыві, свёкра, цесця і цешчы), якім яны былі налічаны ў якасці асабістай маёмаснай квоты, але ў суме не больш за 250 ІПЧ «Маёмасць» на працягу ўсяго перыяду бязвыплатнай прыватызацыі. Абмен у гэтым выпадку праводзіцца па заяве пакупніка з указаннем у ім, ад каго атрыманыя чэкі, без прадстаўлення дакументаў, якія



пацвярджаюць роднасныя адносіны. У выпадку паведамлення пакупніком у заяве лжывых звестак адносна ІПЧ «Маёмасць», перааформленых ад пералічаных вышэй сваякоў і выкарыстаных для абмену, складзеная здзелка з'яўляецца нікчэмнай.

### Паўторнае выкарыстанне не прадугледжана

Важна разумець, што калі вы абмянялі чэкі на акцыі, то назад іх ужо не вярнуць. І вось чаму. У адпаведнасці з заканадаўствам мэтавае прызначэнне імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» — іх прымяненне для набыцця прыналежных дзяржаве акцый акцыянерных таварыстваў. Абмяняўшы імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць» на акцыі, грамадзяне нашай краіны становяцца іх акцыянерамі. У сувязі з чым імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць» лічацца выкарыстанымі. Магчымасць вяртання імянных прыватызацыйных чэкаў для паўторнага выкарыстання заканадаўствам не прадугледжана.

Нагадваем, тэрмін абарачэння чэкаў «Маёмасць» падоўжаны да 31 снежня 2025 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кітаі назвалі ЗША і НАТА найбуйнейшым дэстабілізуючым фактарам



Аб гэтым заявіў афіцыйны прадстаўнік Міністэрства абароны КНР Тань Кэфэй. Ён адзначыў, што доказам вельмі негатыўнай ролі Вашынгтона ў рэгіёне могуць служыць яго спробы развіваць такія блокавыя структуры, як AUKUS, а таксама імкненне не выконваць дамоўленасці, якія датычацца кантролю над узбраеннямі. Пад лозунгам абароны бяспекі Вашынгтон увесь час спрабуе абгаварыць КНР, заяўляючы міру аб існаванні так званай кітайскай пагрозы. Тань Кэфэй дадаў, што пад добрапрыстойнымі падставамі НАТА планує стаць «найбуйнейшым ядзерным аб'яднаннем». Тым самым, як адзначаецца, гэты ваенна-палітычны блок стварае пагрозу ўзнікнення на планеце разбуральнага канфлікту. Афіцыйны прадстаўнік нагадаў, што Кітай прытрымліваецца абарончай стратэгіі і ніколі першы не будзе выкарыстоўваць свой ядзерны арсенал.

### Малайзія плануе пабудаваць самую вялікую ў Паўднёва-Усходняй Азіі сонечную электрастанцыю



Гэта робіцца для таго, каб дасягнуць узроўню выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі ў 70 працэнтаў да 2050 года, паведаміла Bloomberg. «Праграма National Energy Transition Roadmap [NETR] — спроба змяніць магутнасць аднаўляльных крыніц энергіі для павелічэння нашых устаноўленых [энергетычных] магутнасцяў з дапамогай прыродаахоўнай інфраструктуры і тэхналогій», — цытуе агенцтва міністра эканомікі Рафізі Рамлі. Будаўніцтвам СЭС зоймецца суверэнны фонд дабрабыту Khazanah Nasional Bhd., будуць прыцягнутыя інвестыцыі ў памеры шасці млрд рынгітаў ($1,3 млрд). План будаўніцтва СЭС з'яўляецца адным з дзесяці праектаў коштам 25 млрд рынгітаў ($5,5 млрд), якія былі прадстаўлены ў рамках праграмы NETR, апублікаванай у маі ў Куала-Лумпуры. Аднаўляльныя крыніцы энергіі ў Малайзіі сёння складаюць чвэрць ад агульных магутнасцяў.

### Тэмпература вады ў Міжземным моры пабіла рэкорд



Днямі тэмпература паверхні Міжземнага мора дасягнула самай высокай за ўсю гісторыю назіранняў адзнакі — 28,71 °C, пабіўшы папярэдні рэкорд у 28,25 градуса, устаноўлены ў 2003 годзе. Гэтыя даныя пацвердзілі ў Службе маніторынгу цеплавых хваляў MHW, паведаміў Euronews. Для марской фаўны і флоры гэта складае сур'ёзную пагрозу. Прыклады далёка шукаць не трэба: у 2015—2019 гадах цеплавыя хвалі нанеслі ўрон 50 відам, у тым ліку рэдкім малюскам і каралам. Наступствы перагрэву акіяна будуць адчувацца ў восеньскія і зімовыя месяцы, калі Міжземнае мора будзе выдзяляць назапашанае цяпло. Гэта, верагодна, прывядзе да ўзмацнення штармоў. Кліматолагі прагназуюць моцныя ліўні не толькі на поўдні Еўропы, але і на ўсёй астатняй яе тэрыторыі, паколькі Міжземнае мора — крыніца цяпла і вільгаці для большай часткі кантынента.

# Гісторыя ажывае на «Беларусьфільме»

## НЕ ЗГУБІЦЬ СЯБЕ Ў НОВЫХ РЭАЛІЯХ

Паводле сюжэта, падзеі фільма адбываюцца ў чэрвені 1944 года ў ваколіцах Оршы. Там, дзе разгорталіся некаторыя з падзей маштабнай вызваленчай аперацыі, што ўвайшла ў гісторыю пад назвай «Баграціён». Сімвалічна і тое, што здымкі кінастужкі распачалі якраз 23 чэрвеня, калі пачыналася аперацыя. Што датычыцца жанру, то нам заяўляюць ваенна-гістарычную драму, таму найперш спыталі ў **сцэнарыста Таццяны КОМАНАВАЙ**, як будуць размеркаваны акцэнты.

— Усе «Беларусьфільм» даўным-даўно ахрысцілі «Партызанфільмам», аднак, калі паглыбіцца ў гісторыю, то мала хто ўспомніць, калі мы здымалі па-сапраўднаму партызанскае кіно. Не пра салдат, не пра перамогі, а менавіта пра партызанаў. Гэта насамрэч спецыфічная тэма. І беларусы ці з прычыны сваёй прыроднай сціпласці, ці з-за таго, што не любіць падкрэсліваць свае справы, адсоўваюць сябе на другі план. Мы кажам, што вось Савецкая Армія перамагла фашызм. І гэта праўда. Але варта казаць і пра тое, які ўклад унеслі мы і што зрабілі для Перамогі. Таму нам была важная партызанская тэма. Не проста расповед пра тых, хто змагаецца ў партызанскім атрадзе. А пра людзей, якія некалькі гадоў жывуць у стане вайны, пад яе цяжарам, але пры гэтым хочуць мірнага жыцця. І хочуць не забываць пра ўласнае мірнае прызначэнне. Што настаўніца павінна вучыць, урач — лячыць, інжынер — будаваць масты. Як людзі, арыентаваныя на грамадскае жыццё, знаходзяць сэнс свайго існавання ў ваенных рэаліях, стала для нас важнай тэмай, — дзеліцца Таццяна Команава. — І гістарычны складнік ёсць — дастаткова канкрэтны і просты, вядомы кожнаму беларусу — аперацыя «Баграціён». Магутны партызанскі рух паўнавартасна прыраўнялі да сіл, здольных дапамагчы знішчыць фашыстаў. Гэты двайны ўдар — з фронту і партызанскі з тылу — у многім вызначыў поспех аперацыі «Баграціён», таму наша кінастужка пра людзей, якія не ведалі, што будзе далей, але кожны раз аддавалі сябе, каб змагацца да канца і вызваліць сваю зямлю. У дадзеным сэнсе гісторыя ў нас не ўпрыгожаная. Мы вельмі актыўна працавалі з гісторыкамі, з кансультантамі. І ў нас аповед пра тое, як людзі зрабілі ўсё, каб не жыць ва ўмовах вайны.

Галоўнымі дзеючымі персанажамі з'яўляюцца чатыры сябры-партызаны. У іх у кожнага свая біяграфія, свой лёс і сюжэтныя лініі, але стваральнікі ставяць перад сабой важную задачу — паказаць, што адзін маленькі чалавек, калі ён цалкам аддае сябе справе тут і цяпер, можа стаць вяршыцелем гісторыі. І таму ў цэнтры ўвагі кінематаграфістаў не атрад, армія або нацыя, а тое, што кожны чалавек важны і кожны можа ўнесці свой уклад і стаць тым, хто паверне гісторыю ў той альбо іншы бок.

Будзе ўсё: і барацьба, і каханне, і сяброўства, і здрада, героі і ўчынкі, якія нікога не пакінуць абыякавымі. Вось адзін з прыкладаў — нямецкі ўрач Гельмут. Ён добраахвотнікам пайшоў на фронт, каб служыць сваёй Радзіме. Аднак, убачыўшы рэальную вайну, а не тую, пра якую яму распавядалі, прымае сваё рашэнне адносна далейшых дзеянняў. Цікава назіраць, што адбываецца з чалавекам у момант такога выбару, і што становіцца для яго прыярытэтным.

— Роля такога антыфашысцкага плана ў мяне сапраўды ўпершыню. Хоць неаднаразова я іграў нямецкіх афіцэраў часоў Другой сусветнай вайны. Такая роля — гэта падарунак. Наконт ужывання ў вобраз у мяне ўсё проста: чытаеш сцэнарый, супастаўляеш факты і складаеш уласнае бачанне таго, што адбываецца. І пасля спрабуеш паставіць сябе ў тую сітуацыю, — дзеліцца **акцёр Дзмітрый ФРЫД**. — Персанажа свайго, безумоўна, палюбіў, таму што ён сапраўды герой, здольны на ўчынкі. У любы час перайсці на бок святла і дабра — гэта ўчынак, але ва ўмовах вайны — гэта гераізм.

## СВОЙ СЯРОД ЧУЖЫХ

Для нагляднасці можна папярэдне пазнаёміць вас і з камандзірам паліцаяў Місюрам (Аляксей Кірмуць). Як адзначае сцэнарыст, не варта гэты вобраз непасрэдна суадносіць з асобай чалавека, які ўдзельнічаў у спальванні Хатыні, здрадніка і ката Грыгорыя Васюры. Тут вобраз, хутчэй, зборны, і ў персанажа зусім іншы псіхатып. Разбірацца і аналізаваць больш дэталёва глядач зможа ўжо падчас прагляду фільма.

— Гісторыю самога Васюры я яшчэ вывучаю, бо час мне дазваляе паступова заглыбляцца ў матэрыял. Некаторыя гістарычныя факты пра яго спрабую рэалізаваць на здымачнай пляцоўцы. Самае складанае пакуль што — размаўляць па-нямецку, калі пры гэтым думаеш на іншай мове. Прычым важна, каб размова выглядала натуральна і нязмушана, — распавядае **Аляксей КІРМУЦЬ**. — З маёй акцёрскай абаяльнасцю я сярод мужчын у ваеннай форме выглядаю нібы не з іх кола. Мяне арыентавалі, што персанаж павінен быць нязграбным, смешным. Пры гэтым ён памочнік галоўнага антаганіста. Таму тут з маёй акцёрскай індывідуальнасцю мне зусім не складана ўжывацца ў ролю. А калі б патрабавалася пераўвасабляцца ў рэзка адмоўнага персанажа, то была б ужо работа на супраціўленне.

Запытала ў акцёра, ці варта і магчыма апраўдваць чалавека, які ў рэаліях ваеннага часу мяняе свае погляды, пераходзіць на бок ворага?



— Ты разумееш, што чалавек няправільна паступіў. Хоць ёсць верагоднасць, што яго мучаць сумненні, у любым выпадку ён сваімі прынцыпамі пагарджаецца, таму я яму не спачуваў бы. І мне як акцёру гэта дапамагае, бо калі б я спачуваў, то ён у мяне быў бы не тым, хто патрэбен на пляцоўцы. Ён змаладушнічаў. Мог выбраць іншую пазіцыю і сысці ў партызанскі атрад. Але ж мой персанаж не пайшоў і выбраў тое, як сёння модна казаць, што дазволіць не выходзіць з зоны камфорту. Таму я не магу апраўдваць яго, бо сам бы, вядома, пайшоў у партызанскі атрад.

Зрэшты, і ў партызанскім атрадзе героі будуць не роўнапазітыўнымі, у кожнага з іх ёсць рэальныя прататыпы — члены партызанскай брыгады «Чэкіст». Рэальныя подзвігі людзей і ляглі ў аснову сцэнарыя фільма. Гераічную чацвёрку на экране ўвасобяць Андрэй Сенькін (Іван Райкоў), Аляксей Тахараў (Казбек), Цімур Бурын (Якаў) і Максім Філатаў (Вася).

— Зразумела, што кінематаграфічна мы іх крыху ўпрыгожылі. Але разам з гераізмам гэтых людзей мы імкнуліся паказаць і іншы бок чалавечага быту ў тых рэаліях, бо грамадзянскае насельніцтва, якое аказалася пад акупацыяй, было вымушана бясплатна працаваць, плаціць падаткі. І гэтую гісторыю не ўсе сёння ведаюць. Напрыклад, што аўсвайс — гэта не пашпарт, а як у нас, умоўна, камандзіровачнае пасведчанне, якое дазваляе табе перамяшчэнне з пункта А ў пункт Б. Таму ў нас кіно і пра тое, як жылі людзі пад акупацыяй, хоць часта ў ваенных фільмах гэта застаецца на другім плане, — дадае сцэнарыст.

## ЗНАЙСЦІ СВАЕ АДГАЛОСКІ ЛЮБОВІ

«Цішыня! Матор! Увага! Пачалі!» — чуем, як аддае каманды рэжысёр Іван Паўлаў. І ў кадры пачынае гучаць нямецкая мова. Здымаюць тую самую сцэну, якая стане паваротным пунктам для аднаго з цэнтральных персанажаў. Лакацыю выбралі на заводзе імя Кірава ў Мінску, а па сюжэце ўсё адбываецца ў Оршы. Напярэдадні яшчэ здымкі ў Вілейцы, на натурпляцоўцы і ў іншых месцах. Але галоўнае — не столькі, дзе разгортваецца дзеянне, а як раскрываюцца героі. Чые ідэалы яны падзяляюць, які бок абіраюць?

Эмоцыі, атмасфера ў кадры — усё пераносіць у часы мінулага... «Асцярожна вельмі, а то дрыжыць камера!» — звяртаецца рэжысёр да прысутных на здымачнай пляцоўцы. А там камендант учыніў «разбор палётаў» для нашага ўжо знаёмага доктара Гельмута... У перапынках паміж сцэнамі ўдаецца паразмаўляць і з самім **рэжысёрам**. **Іван ПАЎЛАЎ** распавядае, што падрыхтоўчы перыяд (з падборам акцёраў, выбарам лакацый) заняў усяго каля двух месяцаў. Найбольш увагі ўдзялялі сюжэтнай гісторыі і самім персанажам.

Цяпер здымкі фільма — «на экватары», а значыць, палова гісторыі адзнятая. Улічваючы, што над ёю працуе зладжаная каманда прафесіяналаў, неўзабаве мы дачакаемся свайго кіно. Дарэчы, і гэтым разам у камандзе стваральнікаў кінааператар-пастаноўшчык Вячаслаў Дунаеў, мастак-пастаноўшчык Уладзімір Царыковіч, мастак па касцюмах Алена Ігруша. Прыемна адзначыць і той факт, што да работы над фільмам рэжысёр праекта далучае маладых, будучых стваральнікаў кіно: акцёры, памочнік рэжысёра, будучыя аператары маюць магчымасць спасцігаць прафесію ўжывую. У завяршэнне цікаўлюся ў Івана Паўлава, як загучыць у новым фільме запавет яго настаўніка Віктара Турава «Здымайце пра любоў».

— Нягледзячы на тое што першапачаткова не прадугледжвалася лініі ўзаемаадносін паміж мужчынай і жанчынай, мы паспрабавалі з акцёрамі знайсці яе. Але ж любоў мае вельмі розныя формы: любоў да тварэння, а не да разбурэння; любоў да людзей, якія побач. Не буду казаць, што гэта па-хрысціянску, але без гэтага не можа адбыцца чалавек, асоба. Вось наш герой Райкоў любіць будаваць масты, а цяпер павінен падрываць іх. На такой супярэчнасці некаторыя эпізоды і будуюцца. Безумоўна, любоў да роднага краю, дзе жывеш і які абераеш. Я перакананы, што і ў дыялогах, і ў паваротах сюжэта гледачы змогуць адшукаць свае адгалоскі любові. Кожны мой фільм — нібы белы аркуш, на ім я пішу штораз новую гісторыю. І, думаю, тая, што здымаецца цяпер, будзе гледачам цікавая.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота дадзена кінастудыяй «Беларусьфільм».**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

**Извещение о проведении повторных публичных электронных торгов (аукциона)**

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | Гражданин Республики Беларусь |
| **Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона)** | Извещение о проведении публичных электронных торгов опубликовано 25.05.2023 в газете «Звязда» № 98 (29978), стр.13 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование |
|---|---|
| **1** | **Изолированное помещение** (квартира), расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, д. 22, кв. 64, состоящее из одной жилой комнаты, инв. № 644/D-30907, общ. пл. 30,6 кв. м |

Начальная цена – по цене исходя из стоимости в белорусских рублях, эквивалентной 17 100,00 долларов США по курсу НБ РБ на день проведения торгов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 10 (десять) рабочих дней** со дня проведения аукциона, но до подписания акта приема-передачи предмета

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by, www.iin.by**

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Также сообщаем, что в отношении объекта аукциона имеются обременения – ипотека. Правообладатель обременения: Гражданин Республики Беларусь

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 09.08.2023, начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 08.08.2023 г. до 16.00 |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР» 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-187148 площадью 212,3 кв. м, наименование – склад, назначение – складское помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-22. Наличие мест общего пользования.

**Обязательное условие аукциона по лоту № 1**: обязанность покупателя обустроить отдельный вход в приобретаемое им изолированное помещение.

**Нач. цена: 32 029,38 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 3202,93 бел.руб.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-197433 площадью 14,5 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-1а. Наличие мест общего пользования.

**Нач. цена: 2498,50 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 249,85 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения аукциона: 29.08.2023 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 31.07.2023 с 08.30 по 28.08.2023 до 17.30. **Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г.Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**, **код операции 40901**. Условия аукциона: победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по нач. цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 кал. дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. Расходы Продавца на подготовку документов по лоту № 1 – 204,36 бел. руб. с НДС (паспортизация, регистрация); по лоту № 2 – 475,45 бел. руб. с НДС (паспортизация, регистрация, экспертиза достоверности оценки).

**Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 611 40 46, Труханович Александр Владимирович.

Сядзі і глядзі

# «Фактар.by» — новае вяртанне




**Белтэлерадыёкампанія працягвае збор заявак на ўдзел у новым сезоне самага папулярнага музычнага праекта краіны — «Фактар.by». Але зрабіць гэта можна толькі да канца ліпеня. А з 3 па 7 жніўня ў Мінску па адрасе пр-т Пераможцаў, 49 ужо пройдуць першыя сустрэчы з патэнцыйнымі героямі шоу. Амбіцыйныя выканаўцы зноў атрымаюць шанц выйсці на сцэну, каб заявіць пра сябе і скарыць сэрцы знакамітых настаўнікаў.**

Як вядома, праект «Фактар.by» — не толькі пра музыку, але і пра таленавітых людзей з іх незвычайнымі жыццёвымі гісторыямі. Выступаючы перад зорнымі настаўнікамі, хтосьці зноў здабывае веру ва ўласныя сілы, іншыя атрымліваюць запаветную хвіліну славы, а самыя таленавітыя і харызматычныя ў перспектыве працягваюць барацьбу за галоўны прыз — права падпісаць прафесійны кантракт. Фіналісты папярэдніх сезонаў пад эгідай прадзюсарскага цэнтра і пры падтрымцы Белтэлерадыёкампаніі сёння паспяхова скараюць хіт-парады беларускіх і замежных радыёстанцый з аўтарскім матэрыялам і збіраюць канцэртныя залы.

Трэці сезон шоу таксама дасць магчымасць усім жадаючым паспрабаваць паўтарыць поспех Анастасіі Краўчанкі, Мікіты Бялько, Івана Дзятлава і шэрагу іншых выканаўцаў, чые імёны цяпер ведае ўся краіна. Хто зможа даказаць настаўнікам і гледачам, што валодае тым самым фактарам, і стане новай зоркай на небасхіле беларускага шоу-бізнесу — пакуль пытанне, аднак першы крок да сваёй мары варта зрабіць ужо цяпер.

Стаць удзельнікам трэцяга сезона можа кожны. Прыём анлайн-заявак — анкет і фрагментаў вакальных выступленняў — адкрыты на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by. А больш падрабязную інфармацыю шукайце на партале медыяхолдынга, адсочвайце ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» ці ў Telegram-канале ATN_NEWS.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 177

У сённяшняй задачы — два аўтары: Мікалай Бельчыкаў і Міхаіл Мароз з Барысава *(гл. дыяграму)*.

**Белыя:** Крg4, Ла3, Лb5, Сb6, Сf7, Кb3, Кh5, пп. с2, f6 (9).

**Чорныя:** Кре4, Лd7, Сf2, Кf8, Кh3, пп. а5, е5, g7 (8).




**Мат за два хады.**

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б Хмяльніцкага, 10а, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Працягнем знаёмства з вынікамі міжнароднага конкурсу да 80-годдзя Курскай бітвы, арганізаванага ў Расіі. У раздзеле шматхадовак тры задачы Аляксандра Варыцкага (Брэст) адзначаны пахвальнымі водгукамі. Першая з іх складзена сумесна з Відадзі Заманавым (Азербайджан).

**№ 1**

**Белыя:** Крf2, пп. b4, е4, g2 (4).

**Чорныя:** Крh1, пп. f7, h2 (3).

**Мат за 13 хадоў.**

1. b5? f5! 2.b6 fe! Рашае 1.е5! f5 2. е6 f4 3. е7 f3 4. Кр:f3 Крg1 5. е8Ф h1Ф 6. Фе1+ Крh2 7. Ф:h1 Кр:h1 8. Крf2! Крh2 9. b5 Крh1 10. b6 Крh2 11. b7 Крh1 12. b8Л! Крh2 13. Лh8х

**№ 2**

**Белыя:** Крh3, Фd2, Кс3 (3).

**Чорныя:** Крb2, Са3, пп. с2, h4 (4).

**Мат за 11 хадоў.**

1. Кd5? Сс5!; 1. Ке4? Крb3!; 1. Кb5? Сс5! Рашае 1. Ке2! Крb1! 2. Фd3 Сb2 3. Фе4! zz 3...Кра2! 4. Ф:с2 Кра3 5. Фс4 Сg7 6. Кс1 Крb2 7. Кd3+ Кра3 8. Фb4+ Кра2 9. Кс1+ Кра1 10. Фb3, 11. Фа2х або 3...Сf6 4. Фb4+ Кра1 5. Фb3 Сb2 6. Фс2 Сf6 7. Кс1 Сb2 8. Кb3+ Кра2 9. Кd2 Кра1, Кра3 10. Фb1, Фb3х.

**№ 3**

**Белыя:** Крh3, Фе5, Сd4, Се2, Ка1, Кg8, пп. b2, d7, е6, е7, h6 (11).

**Чорныя:** Крb7, Фh1, Ла8, Кс8, Ке1, пп. а7, b6, с6, d3, е4, f5, g2, h2 (13).

**Мат за 17 хадоў.**

